# Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва» (БДАМЛМ)

вул. Кірылы і Мяфодзія, 4
220030, г. Мінск
тэл.: +375 17 316 47 81, +375 17 242 51 88
факс: +375 17 373 14 00
эл. пошта: info@bdamlm.by
сайт: bdamlm.by
facebook.com/bdamlm




285

ВЕТ МИНИСТРОВ БЕЛОРУССКОЙ ССР

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

от "9" 1960 года № 323
гор.Минск

О создании Центрального государственного архива литературы и искусства БССР.

В целях концентрации и улучшения хранения документальных материалов литературных, театральных, музыкальных и художественных организаций, издательств и других учреждений, ведающих вопросами литературы и искусства, Совет Министров Белорусской ССР ПОСТАНОВЛЯЕТ:

Создать в гор.Минске Центральный государственный архив литературы и искусства БССР.

Председатель
Совета Министров Белорусской ССР /Т.Киселев/

Управляющий делами
Совета Министров Белорусской ССР /Г.Рудак/

Пастанова Савета Міністраў БССР ад 9 чэрвеня 1960 г. № 323 «Аб стварэнні ЦДАЛМ БССР»

- Створаны 9 чэрвеня 1960 г. як Цэнтральны дзяржаўны архіў літаратуры і мастацтва БССР (ЦДАЛМ БССР)
- 24 сакавіка 1976 г. рэарганізаваны ў Цэнтральны дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва БССР (ЦДАМЛМ БССР)
- 21 мая 1993 г. перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ)
- 29 мая 2003 г. атрымаў назву «Установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва» (БДАМЛМ)

# У структуру БДАМЛМ уваходзяць 5 аддзелаў:

- архіваў арганізацый і фарміравання Нацыянальнага архіўнага фонду
- навуковага апісання дакументаў асабістага паходжання
- забеспячэння захаванасці дакументаў
- інфармацыйна-пошукавых сістэм і аўтаматызаваных архіўных тэхналогій
- інфармацыі, публікацыі і выкарыстання дакументаў



Калектыў БДАМЛМ. 2021 г.

Па стане на 1 студзеня 2022 г. архіў-музей налічвае:

- 521 фонд
- 125 554 адзінкі захоўвання
- 653 музейных прадметаў

Храналагічны перыяд: з 1812 г. па цяперашні час (асобныя матэрыялы – копіі дакументаў XIII-XIX стст.)

Найбольшую частку фондаў БДАМЛМ складаюць **пісьменніцкія архівы**. Сярод іх зборы і калекцыі дакументаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, сям'і Максіма Багдановіча, Цішкі Гартнага, Івана Грыгаровіча, асабістыя архіўныя фонды Алеся Адамовіча, Адама Бабарэкі, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Янкі Брыля, Канстанцыі Буйло, Васіля Быкава, Максіма Гарэцкага, Ніла Гілевіча, Сяргея Грахоўскага, Уладзіміра Дубоўкі, Язэпа Дылы, Уладзіміра Караткевіча, Еўдакіі Лось, Міхася Лынькова, Івана Мележа, Пімена Панчанкі, Алеся Петрашкевіча, Язэпа Пушчы, Максіма Танка, Паўлюка Труса, Івана Шамякіна і іншых.



**Музычная культура** Беларусі адлюстравана ў фондах кампазітараў Льва Абеліёвіча, Сяргея Аксакава, Анатоля Багатырова, Генрыха Вагнера, Яўгена Глебава, Васіля Залатарова, Аляксея Клумава, Дзмітрыя Лукаса, Пятра Падкавырава, Рыгора Пуксты, Юрыя Семянякі, Яна Тарасевіча, Яўгена Цікоцкага, Мікалая Чуркіна, Марка Шнэйдэрмана і іншых, этнографа і кампазітара Якава Прохарава, музыказнаўцаў Дзмітрыя Жураўлёва, Лідзіі Мухарынскай, Ізідара і Сімы Нісневічаў, Юльяна Дрэйзіна і іншых.



Творчая сустрэча ў Саюзе кампазітараў БССР. 1953 г.



Б. Платонаў (Эзоп) і З. Браварская (Клея) у спектаклі “Ліса і вінаград”. 1957 г.

**Тэатральнае мастацтва** ў БДАМЛМ прадстаўлена асабістымі фондамі артыстаў і рэжысёраў Ганны Абуховіч, Ларысы Александроўскай, Ісідара Балоціна, Уладзіміра Дзядзюшкі, Ірыны Ждановіч, Аляксандра Кістава, Аляксандры Клімавай, Раісы Кашэльнікавай, Еўсцігнея Міровіча, Паўла Малчанава, Галіны Макаравай, Рыты Млодак, Барыса Платонава, Стэфаніі Станюты, Цімафея Сяргейчыка, Тамары Узунавай, сям’і Уладамірскіх, Расціслава Янкоўскага і іншых.

Гісторыя **выяўленчага мастацтва** адлюстравана ў фондах мастакоў Івана Ахрэмчыка, Валянціна Волкава, Яўгена Красоўскага, Мікалая Тарасікава, Арлена Кашкурэвіча, Льва Лейтмана, Аляксандры Паслядовіч, Анатоля Тычыны, Аскара Марыкса, Барыса Малкіна, скульптараў Сяргея Селіханава, Аляксея Глебава, мастацтвазнаўцаў Гурыя Барышава, Міхаіла Кацара, Фрумы Лейтман і іншых.



Л. Лейтман. «Девушка». 1967 г.



Б. Малкін. «Жоўты клоун». 1966-1968 гг.

У БДАМЛМ захоўваецца комплекс дакументаў **па гісторыі кінематаграфіі**. Ён прадстаўлены фондамі аднаго з заснавальнікаў беларускага кіно Уладзіміра Корш-Сабліна, рэжысёраў Віктара Турава, Аляксандра Гутковіча, Віталя Чацверыкова, кіназнаўцаў Іллі Рэзніка, Ефрасінні Бондаравай і іншых.






Фатаграфіі кадраў з першага беларускага мастацкага фільма «Лясная быль» (рэж. Ю. Тарыч). 1926 г.

Фонды архіва-музея актыўна папаўняюцца дакументамі дзеячаў беларускай культуры Аўстраліі, Вялікабрытаніі, Германіі, ЗША, Канады, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Чэхіі і інш.






Дакументы з асабістага архіва опернага спевака М. Забэйды-Суміцкага, якія паступілі ў БДАМЛМ з Чэхіі ў 1985 г.

Каля 20% фондаў БДАМЛМ прадстаўлена дакументамі **ўстаноў і грамадскіх арганізацый**:

- выдавецтваў, рэдакцый часопісаў і газет
- творчых саюзаў
- тэатраў, музеяў, кінастудыі «Беларусьфільм»
- творчых калектываў і ансамбляў



**Музейны фонд** БДАМЛМ утвараюць багатыя калекцыі: фалерыстыкі, тканін, мастацкіх партрэтаў, скульптур, музычных інструментаў, гадзіннікаў, вырабаў з дрэва, посуду, пісьмовых прылад.



Прадметы побыту сям’і Багдановічаў



Шахматы і гадзіннік А. Бабарэкі

**Бібліятэка** БДАМЛМ налічвае каля 33 000 кніг і 50 000 часопісаў і газет. Сярод унікальных кніг і выданняў газеты «Наша доля», «Наша ніва», «Вольная Беларусь»; часопісы «Маладняк», «Узвышша»; стараабрадная передрукоўка Псалтыры 1645 г., выдадзеная ў 1849 г.; першыя выданні зборнікаў Я. Купалы, Я. Коласа; амаль усе выданні граматыкі Б. Тарашкевіча; кнігі В. Ластоўскага, Я. Лёсіка і шмат іншых.




Рукапісны малітоўнік. Др. пал. XVIII ст.




Выданне «Живописная Россія». 1897 г.

# Унікальныя і асабліва каштоўныя дакументы з фондаў БДАМЛМ



Нататнік Карла Кастравіцкага з аўтографамі ўдзельнікаў паўстання 1863 г.

Частка подпісаў была зроблена летам 1864 г. пад дахам Мінскага кляштара бернардзінцаў.
У 1991 г. БДАМЛМ пераехаў у будынак былога касцёла бернардзінцаў, які разам з кляштарам утварае адзіны архітэктурны комплекс. У 1992 г. вяртаюцца сюды і тыя лісткі, якія былі напісаны ў гэтых сценах сто дваццаць восем гадоў назад.

# Адзін з самых ранніх фотаздымкаў







Павел Кукальнік (гісторык, пісьменнік) са сваімі хрэснікамі Андрэем (будучы вядомы беларускі археолаг, этнограф, музеязнавец) і Кацярынай Сніткамі. 1869 г.

Фотаатэлье Прывальскага, г. Вільня.




І.І.Грыгаровіч. «Белорусский архив древних грамот». Ч. 2.
Рукапісны зборнік. 1825 г.



Дорогой Юрий Моисеевич!
Как живете. Пишите.
Пересылаю открытое
письмо Шульмана
котор. был у меня
Впечатление на меня он
произвел смешанное
и поставил и совсем
не понял Лейба
котор. был когда-то живой
парень. Ничего мещанин
об его искусстве ничего
не знаю. Одним словом
Дорогой Юрий Моисеев
передайте поклон моей
сестре мои старые
работы сестре Зине
может быть она
сумеет их сохранить



мне переслать
Как живете?
Пишите обо
всем. Вышлите
или просите редакц.
выслать ваши
записки мне
Я Вас тоже вышлю
и скоро дам эту же
заметку в др. журнал
в Париже. Очень много
работы у меня
очень занят.
Привет от моих
Ваш
Шагал

382-1-40

Ліст М. Шагала да Ю. Пэна. [1927 г.].

**Унікальны**

## Фонд № 3 «Калекцыя дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў г. Вільня»

Найбагацейшая крыніца па гісторыі беларускага Адраджэння XIX – першай трэці XX ст.:

- фрагменты асабістых архіваў Цёткі, В. Ластоўскага, братоў Луцкевічаў, Б. Тарашкевіча, К. Дуж-Душэўскага і інш.
- дакументы беларускіх культурна-асветніцкіх арганізацый
- дакументы рэдакцый беларускіх газет, часопісаў і выдавецтваў
- дакументы беларускіх партый, камітэтаў, саюзаў і таварыстваў
- калекцыя фатаграфій беларускіх культурных і палітычных дзеячаў і ўдзельнікаў з’ездаў, канферэнцый і ўрачыстасцяў




Старонкі Інвентарнай кнігі Беларускага музея імя І.Луцкевіча. 1922 - 1930-я гг.

Пачынаючы з 1999 г. БДАМЛМ праводзіць **навуковыя канферэнцыі**. З 2001 г. штогод ладзяцца традыцыйныя літаратуразнаўчыя «Узвышаўскія чытанні», а з 2003 г. – архівазнаўчыя «Архіўныя чытанні». Па выніках канферэнцый выдадзена 6 зборнікаў матэрыялаў.



XVI Архіўныя чытанні, 4 кастрычніка 2018 г.



















Зборнікі матэрыялаў навуковых канферэнцый

БДАМЛМ рыхтуе і выдае **дакументальныя зборнікі, археаграфічныя публікацыі**, заснаваныя на матэрыялах асабістых фондаў дзеячаў літаратуры і мастацтва. За апошнія дзесяцігоддзі пабачылі свет каля 40 выданняў: збор твораў А. Бабарэкі, выбраныя творы З. Верас, А. Наўроцкага, мемуары П. Мядзёлкі, анталогія беларускай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду «Бліскавіцы», дзённікі беларускіх паэтаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны, летапіс Дукорскай Петра-Паўлаўскай царквы, нотныя выданні і шмат іншых.



# Альманах «Аўтограф»

У 2020 г. БДАМЛМ распачаў выданне ўласнага архіўнага альманаха «Аўтограф», дзе змяшчаюцца выбраныя артыкулы і публікацыі, прысвечаныя фондам, дакументам і праблемам практычнай дзейнасці архіва-музея, выбраныя даклады, якія прагучалі на «Узвышаўскіх» і «Архіўных чытаннях».



Кожны год БДАМЛМ арганізоўвае **выставы**, прысвечаныя юбілеям вядомых дзеячаў літаратуры і мастацва (у тым ліку віртуальныя выставы на сайце архіва-музея). Удзельнічае ў сумесных выставачных праектах з Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры, Прэзідэнцкай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь і інш.









З 2019 г. архіў-музей удзельнічае ў праекце Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **«На хвалі часу, у плыні жыцця»**, прымеркаваным да 100-годдзя літаратурнага аб’яднання «Маладняк». Праект разлічаны да 2023 г. і ўключае розныя мерапрыемствы: выставы, круглыя сталы, лекцыі, прэзентацыі, літаратурныя конкурсы і інш.




Удзельнікі першага з’езда літаб’яднання «Маладняк». 1925 г.



Падрыхтавана спецыяльна
да 100-годдзя архіўнай службы Беларусі

*Аўтар: Таццяна Іванова*